# СТАЦЬ ЛІТВІНАМ І БЫЦЬ ІМ

**развагі да перапісу 2009**



**Меньск-Літоўскі**

**Стаць Літвінам і быць ім:** развагі да перапісу 2009 г., А.Стральцоў-Карвацкі;
Меньск-Літоўскі, 2008. - 24 с.

© тэкст **А.Стральцоў-Карвацкі**

## Кароткі гістарычны экскурс

У дзяржаўным сэнсе найменьне **Літва** здаўна адносіцца таксама і да тэрыторыі Беларусі. Вялікая колькасьць сёньняшніх беларусаў, пераважна на захадзе Краю, але і ня толькі, аж да пачатку XX стагодзьдзя называлі сябе **Літвінамі**. Тэрміны Беларусь і Беларусы навязаны нашаму Краю расейскай адміністрацыяй у пачатку XIX стагодзьдзя. Беларусь зьяўляецца адной з пераемніц Вялікага Княства Літоўскага. На нашых землях паўстала вялікая дзяржава ВКЛ, аб'яднаўшы ў XV стагоддзі раней асобныя княствы-землі: Наваградзкае, Полацкае, Смаленскае, Турава-Пінскае, Гарадзенскае і інш.

У этнагэнэзе **Беларусаў-Літвіноў** удзельнічалі славянскія і балцкія плямёны: полацкія, пскоўскія, смаленскія крывічы, тураўскія дрыгавічы, частка палескіх валынянаў, падляскія яцвягі, прусы з Прусіі, дайнава і ўрэшце племя Літва. З пляменных назваў перамагла назва Літва, даўшы сваё імя аб'яднанай і цэнтралізаванай дзяржаве – Вялікаму Княству Літоўскаму, дзе наша мова мела статус дзяржаўнай. На ёй былі напісаны ўсе Літоўскія Статуты (канстытуцыі) 1528, 1566 і 1588 гг., на ёй вялася канцылярыя ВКЛ – Літоўская Мэтрыка, каралеўскія, вялікакняскія і прыватныя адміністрацыйныя і судовыя акты.

Менавіта ў адной з першых сталіц ВКЛ – Наваградку каранаваўся на караля першы кароль Літвы – Міндоўг. Назвы вёсак і мястэчак: Літва, Літвіны, Літвяны, Літвянцы, Літоўка, Літавец, Літоўчыкі, Літоўск, Літоўшчына, Літоўцы, Літвічы, Літвін, Літвінава, Літвінкі, Літвінчычы, Літвінаўка, Літвякі і інш. рассеяны па ўсёй тэрыторыі сённяшняй Беларусі і там, дзе калісьці даходзілі межы ВКЛ.

## Актуальны стан

У сёньняшнім грамадзтве вельмі важным пытаньнем ёсьць самаазначэньне чалавека. Шматлікія культурныя плыні нясуць свае хвалі з розных краін і кантынэнтаў, а чалавеку ў Нашым Краі неабходна заставацца самім сабой. У брашуры прадстаўлены развагі, чаму сьвядомасьць жыхароў Рэспублікі Беларусь нагэтулькі размытая і не прыводзіць да яснай самаідэнтыфікацыі.

Перш за ўсё паглядзім, якім чынам чалавек набывае дадзеную сьвядомасьць, бо, вядома, што яна яму не даецца цалкам ад нараджэньня. Увогуле, самасьвядомасьць, у тым ліку і нацыянальная, – гэта **пачуцьцё асобнасьці** адносна іншых, якое фармавалася такімі нацыятворчымі фактарамі як: сымбалі, мова, крэўныя вузы, адносіны да культурнай спадчыны, тэрыторыі і нацыянальны характар. Заўжды пераможны ўплыў на самасьвядомасьць аказвае веравызнаньне, якое для праўдзівага верніка зьяўляецца найвышэйшай катэгорыяй земскага сьвету. Пачуцьцё нацыянальнай сьвядомасьці асабліва праяўляецца ў крызысных сытуацыях, калі патрэбныя супольныя дзеяньні дзеля агульназразумелага дабра народу.

Задамо пытаньне, ці наш народ знаходзіцца сёньня ў крызыснай сытуацыі? Паводле папярэдняга вызначэньня – хіба не, бо ня бачна моцнага праяўленьня нацыянальнай сьвядомасьці. У той жа час відавочнае праяўленьне сьвядомасьці сацыяльнай. Ці можа сацыяльная сьвядомасьць замяняць нацыянальную? Так, можа, і прыклады таму былі ў гісторыі. Гэтак у сярэднявеччы, абсалютная большасьць сялян у Эўропе ня мела выражанай нацыянальнай сьвядомасьці, але паўсюдна акрэслівала сябе як людзей “простых”, “тутэйшых”, адрозных ад “паноў”, хаця ў той жа час гэтыя сяляне мовілі ўласьцівай ім мясцовай мовай і можна было б іх трактаваць як асобную

этнічную групу.

У гэтых разважаньнях мы павінны таксама прымаць пад увагу і складанасьць, якую накладае на наш рэгіён культурна-рэлігійны падзел. Яна праяўляецца ў тым, што крэўныя вузы ў нашым рэгіёне не заўжды аўтаматычна перакладаюцца на самаазначэньне ў нацыянальным сэнсе, а ў мяшаных сем'ях гэтае самаазначэньне становіцца пытаньнем асабістага, сьвядомага выбару чалавека. Нават у выпадках, калі сямейная сытуацыя здаецца не пакідае сумневаў адносна нацыянальнага самаазначэньня, агульная культурная сытуацыя, кан'юнктура ды іншыя фактары могуць аказаць пераможны ўплыў на вынік гэтага самаазначэньня.

Менавіта таму і ёсьць асаблівы сэнс у напісаньні дадзенай працы дзеля Нашага Краю, дзе часта вызначэньне ўласнай сьвядомасьці ёсьць актам волі, а не даецца аўтаматычна звыш.

## Ці найменьне “Беларус” адпавядае жыхарам Нашага Краю?

Прычынай, чаму мы пачынаем ад крытыкі найменьня “Беларус” ляжаць навідавоку. Калі ўважлівей прыглядзецца да людзей, што гэтак сябе акрэсьліваюць і пазнаёміцца з дастатковай іх колькасьцю выяўляецца наступны факт. Гэтае найменьне ня мае іншых аб’ядноўваючых характарыстык апроч тэрытарыяльнай і дзяржаўна-грамадзянскай прыналежнасьці. Толькі ў такім сэнсе і толькі сёньня назвай Беларус можна карэктна акрэсьліць усіх жыхароў Рэспублікі Беларусь.

Калі ў папярэднем разьдзеле мы давалі паняцьце самасьвядомасьці, то ўзгадвалі пры гэтым, што апроч тэрыторыі павінны існаваць і іншыя фактары: сымбалі, мова, крэўныя вузы, адносіны да культурнай спадчыны і нацыянальны характар. Атрымліваецца, што паводле гэтых іншых фактараў насельніцтва РБ выказвае шырокую разнастайнасьць, у якой нярэдка прысутнічаюць узаемавыключныя погляды. Найбольш відавочнымі зьяўляюцца сымбалі і мова. Адна частка тых, хто называе сябе Беларусамі прызнаюць сваімі гэрб “Пагоню” і бел-чырвона-белы сьцяг, другой бліжэй камуністычна-масонская сымболіка “сталінскай выпечкі”. Частка сёньняшніх Беларусаў сьвядома ці несьвядома размаўляе на беларускай мове, альбо дыялектах да яе набліжаных. У той жа час большасьць беларускага насельніцтва буйных гарадоў ставіцца да гэтай мовы і яе будучага лёсу, мякка кажучы, абыякава.

Адносіны да культурнай спадчыны таксама фіксуюць істотныя падзелы. Тут сытуацыя нават больш складаная, чым з сымбалямі, бо прысутнічаюць два і больш поглядаў. Для адных сваёй зьяўляецца клясычная расейская культура, якая грунтуецца на расейскай літаратуры XIX веку. Сярод моладзі і сярэдняга пакаленьня пераважае

прыхільнасьць да расейскай культуры пералому XX-XXI стагодзьдзяў у іх папулярным і вульгарна-турэмным кшталтах.

Большасьць Беларусаў, якія акрэсьліваюць сябе як сьвядомыя, адчуваюць моцную прыхільнасьць да народнай культуры, якая ў жывым варыянце, нажаль, вымірае разам з сацыяльна-дэмаграфічнымі зьменамі, якія закранулі сяло, і існуе ў рэканструяваным варыянце, прадстаўленым прафэсыйнымі фальклёрнымі калектывамі. Частка сьвядомых Беларусаў ня хочучы абмяжоўваць сябе выключна гэтай пост-сялянскай культурай мае дзьве магчымасьці для выбару: а) сучасная касмапалітычная заходняя культура (ці антыкультура – як каму больш да спадобы); б) шляхэцка-арыстакратычная культура Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай. Асноўная маса ідзе шляхам а), паколькі ён не патрабуе вялікіх высілкаў у рэалізацыі падобнага тыпу культуры і толькі нешматлікая меншасьць спрабуе ажывіць і рэканструяваць сярэднявечную і сармацкую культуру нашых продкаў.

Ёсьць урэшце і трэцяя група жыхароў нашай краіны, якія ўважаюць сябе за Палякаў і якім шляхэцка-арыстакратычная культура былога ВКЛ зьяўляецца роднай.

Водле веравызнаньня падзел сучасных Беларусаў з дакладнасьцю акрэсьліць нельга. Прычынай гэтаму доўгі пэрыяд камунізму, які нібы “замарозіў” і згладзіў існаваўшыя на пачатку XX ст. падзелы. Тым ня менш для практыкуючых – якія наведваюць царкву альбо касьцёл штонядзелі – вернікаў, што складаюць прыкладна 5-10% насельніцтва, такія падзелы відавочныя.

Аб нацыянальным характары можна было б разважаць вельмі доўга, адзначым толькі, што так званая “талерантнасьць” ёсьць нічым іншым, як страхам перад канфрантацыяй, якую можа выклікаць ад-

крыцьцё праўды аб узаемавыключных фундамантах, на якіх сёньня трымаецца “афіцыйная і неафіцыйная беларуская сьвядомасьць”. На нашу думку фундамэнтам гэтай “талерантнасьці” ёсьць пост-бізантыйская мэнтальнасьць большасьці насельніцтва. У бізантынізме не існуе дакладнага вызначэньня паняцьцяў, а рэзкае аддзяленьне духовага і сьвецкага жыцьця стварае паралельны рэлігійны сьвет. У гэтым сэнсе шырока распаўсюджанымі зьяўляюцца паводзіны, што ўяўляюць сабой спарадычнае практыкаваньне некаторых формаў пабожнасьці без уплыву на рэальныя паставы і рэальнае жыцьцё ў сьвеце згаданых асобаў. У выніку бальшыня Беларусаў – постбізантыйцаў ставіцца да іншых “талерантна”, што можна таксама трактаваць як абыякавасьць. Але пад узьдзеяньнем розных фактараў, у тым ліку і вонкавых, гэтая група асуджана на размываньне і разыходжаньне ў лягеры з какрэтна ідэнтыфікаванымі каштоўнасьцямі, што вельмі марудна, але адбываецца сёньня.

Мяркуем, што гэтага дастаткова для азнаямленьня чытачоў з актуальна існуючымі прычынамі нашай крытыкі найменьня Беларус. У той жа час неабходна прывесьці таксама прычыны гістарычныя крытыкі гэтага найменьня. Вось жа хаця найменьне Беларус не адлюстроўвае складанай рэчаіснасьці грамадзтва Нашага Краю, але яшчэ больш не адпавядае яму ў гістарычным сэнсе.

Найменьне Беларус паходзіць натуральна ад назвы краю – Беларусь. Гэтая назва была прынесена на землі паміж Дняпром і Нёманам штучна, пры канцы XVIII стагодзьдзя дзеля таго, каб абгрунтаваць далучэньне гэтых земляў да Расейскай Імпэрыі. Да гэтага моманту назва Беларусь вандравала па тэрыторыях сёньняшняй Пскоўшчыны, Цьвершчыны і Смаленшчыны, але ніякім чынам не датычыла тэрыторыяў, што ўваходзяць у Рэспубліку Беларусь. Трэба адзначыць, што назва Русь, якая ёсьць часткай назвы Беларусь ад даўняга часу, менавіта ад скančэньня існаваньня Кіеўскай Русі, ня

носіць характару дзяржаўна-тэрытарыяльнага, але толькі рэлігійна-цывілізацыйны. У Вялікім Княстве Літоўскім Русіны існавалі, але выключна ў значэньні рэлігійным, цывілізацыйным. У сэнсе дзяржаўным маскоўскія ўладары прынесьлі ім назву Беларусь толькі пры канцы XVIII стагодзьдзя.

Чаму ж ня Русь, але Беларусь? Назва Беларусь добра ўкладаецца ў агульную канцэпцыю адзінства ўсіх “людзей рускай цывілізацыі”, да якіх, паводле аўтараў гэтай канцэпцыі, належаць Вялікаросы, Маларосы і Беларусы. Менавіта на гэтым грунтуецца ўся канцэпцыя Заходнерусізму, якую надзвычай няўдала пераняли беларускія адраджэнцы канца XIX – пачатку XX стст.

## Наш Край – Літва

Літва – гістарычна укшталтаваная супольнасьць, якая пачаткова складалася з розных этнічна арыентаваных групаў, пераважна балцкіх і мяшаных балта-славянскіх – у лінгвістычным сэнсе, аб'яднаных доўгатрывалай геапалітычнай неабходнасьцю – пагрозы з захаду, усходу і поўдня – і агульнадзяржаўнай традыцыяй. Вынікам гэтага працэсу стала ўтварэньне палітычнага народу – шляхты Літвы.

Шляхта Літвы напрыканцы свайго канчатковага ўкшталтаваньня як стану амаль цалкам прыняла каталіцкую веру, што і сёньня зьяўляецца важным элемэнтам сьвядомасьці Літвінаў.

Працэсы XIX стагодзьдзя прывялі да заняпаду пазыцый палітычнага народу, у выніку чаго супольнасьці Літвінаў не ўдалося на пачатку XX стагодзьдзя аднавіць сваю дзяржаўнасьць у гістарычных межах. Але ідэя Літвы засталася!

Яна праявілася напрыканцы XX стагодзьдзя, калі разам з заняпадам СССР узьнікла і была агучана ідэя Балта-Чарнаморскай Супольнасьці дзяржаў. Нажаль з прычыны несувымернасьці палітычнага працэсу ў асобных частках былога ВКЛ гэтая ідэя да сёньня не знайшла свайго ўвасабленьня. Але, мы – прыхільнікі ідэі – Літвіны – духовыя нашчадкі шляхты і мяшчанаў ВКЛ ёсьць і мы павінны гуртавацца.

На сёньня можна вылучыць наступныя групы, якія да гэтай ідэі ў той ці іншай ступені адклікаюцца:

- Літвіны – Летувіны культуры балцкай;
- Літвіны культуры польскай;

- Літвіны культуры рускай (беларускай).

Няма нічога дзіўнага ў тым, што Літвіны ў лінгвістычным сэнсе нагэтулькі шматаблічныя. Гэта натуральны вынік існаваньня нашай сярэднявечнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, якая была дзяржавай шматэтнічнай. **Літвіны** ў першую чаргу **нацыя палітычная.**

## Цывілізацыя Літвы - Лацінская Цывілізацыя

2009 год значны вялікай датаю – 1000-годзьдзем першай згадкі ў пісьмовых крыніцах найменьня **Літва** (у лацінскім запісе **Litua**). Яе фіксацыя ў нямецкіх Квэдлінбурскіх Аналах паўстала з трагічнай нагоды забойства вядомага прапаведніка, магдэбургскага каноніка і місыйнага біскупа, апостала – **Бруна з Квэрфурту** (каля 970 – 09.03.1009) - **Хрысьціцеля Літвы**. Спроба пашырыць хрысьціянства сярод прусаў і яцьвягаў скончылася забойствам сьвятога Бруна і яго 18 спадарожнікаў.


MIX.
Subita ex nostris operibus insolita aquarum refusio facta est, III. Id. Januarij, feria secunda, Luna X. multis damnum inferens, VII. diebus in sua rabie persistit. Obijt Recharius Patherbrunensis episcopus. Cui successit Metinwerck. Sanctus Bruno qui cognominatur Bonifacius archiepiscopus et monachus XI. suae conversionis anno in confinio Rusciae et Lituae a paganis capite plexus cum suis XVIII. VII. Id. Martij petijt coelos. Obijt Vuigbertus Merseburgensis episcopus: Cui successit Thiatmarus. Sed et domi

Яны загінулі **на мяжы Літвы і Русі** 9 сакавіка 1009 г. Пасьля апостал Бруна быў абвешчаны сьвятым і яго ўспамін адзначаецца Каталіцкай Царквой 15 верасня. Вышэй - фрагмэнт Квэдлінбурскага летапісу, у якім першы раз згадваецца назва **Літва**.



**Міндоўг -**
**першы Кароль Літвы**, які прыняў каталіцкую веру. Каранаваны ў **1253 г. у Наваградку.**

Дзякуючы Міндоўгу Літва першы раз займела паўнавартасную суб'ектнасьць у сэнсе міжнароднага права тагачаснай Эўропы.

Апошнія дасьледваньні сьведчаць, што кароль Міндаўг, які разам з сынамі быў забіты, **ніколі не выракаўся каталіцкай веры,** як сьцьвярджалася дагэтуль.

## Цывілізацыя Літвы - Лацінская Цывілізацыя



**Маці Божая Вастрабрамская - галоўная патронка Літвы.**

Вострая Брама, збудавана XVI ст. у пэрыяд эпохі Адраджэньня. У 1671 г. манахі кармэліты із суседняга касьцёла сьв.Тэрэзы будуюць у вежы капліцу для абраза Маці Божай Міласэрнасьці, які вядомы сваімі цудамі.

У капліцы вісіць вота (мэталёвая таблічка з удзячнай інтэнцыяй) маршалка Юзэфа Пілсудскага са словамі: **“Дзякуй Табе Маці за Вільню!”**

**Сьвяты Казімер Каралевіч** (1458 - 1484) - **патрон Літвы**, вядомы цудам дапамогі літоўскаму войску ў 1518 г. пры абароне Полацка. Горад быў абкружаны больш як 10 тыс. маскоўскага войска, зь якім быў асабіста Вялікі Князь Маскоўскі Васіль III. На дапамогу месту выправіліся толькі 2 тыс. жаўнераў пад кіраўніцтвам князёў Гаштольда і Баратынскага. З-за разьліву наша войска не магло пераправіцца праз Дзьвіну. **І раптам зь неба зьявіўся маладзён, апрануты ў белае, на белым кані.** Заахвочваючы рыцараў ён скочыў у раку, каб іншыя пайшлі за ім. Менавіта тут была гэтак патрэбная мялізна. Пасьля пераправы, літоўскае войска нечакана напала на непрыяцеля, які кінуўся наўцёкі. Места і замак былі абаронены. Адважны маладзён недзе зьнік, і ніхто яго больш ня бачыў. Тады прыйшла здагадка, што гэта быў сьвяты Казімер.



## Цывілізацыя Літвы - Лацінская Цывілізацыя



**III Літоўскі Статут**, прыняты за панаваньня караля Жыгімонта Вазы, у **1588** г., галоўным укладальнікам якога зьяўляўся канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега. Статут дзейнічаў да **1840** г., калі яго дзеяньне прыпыніў цар Расеі Мікалай I.

III Літоўскі Статут ёсьць дасканалым на свой час кодэксам дзяржаўнага, адміністрацыйнага і крымінальнага права.

Аднаўленьне дзеяньня ў абноўленай форме III Літоўскага Статуту створыць неабходную прававую базу для прынцыповай зьмены заканадаўства Краю ў кірунку лацінскай цывілізацыі.

**Палац Вялікіх Князёў Літоўскіх** - вялікакняская сядзіба і сымбаль улады Вялікіх Князёў у сталічным месьце Вільні. Выгляд паводле стану на пачатак XVII ст. Палац быў **збураны** на пачатку XIX ст. расейскімі ўладамі, згодна з ідэяй зьнішчэньня сымбаляў улады ВКЛ. Зараз знаходзіцца ў **стадыі аднаўленьня.**





**Тадэуш Касьцюшка - Літвін, правадыр паўстаньня 1794 г.** у абароне Канстытуцыі 3 Мая, якая вяртала Польшчы і Літве **спадчыннасьць каралеўскага і вялікакняскага трону.**

Тадэвуш Касьцюшка трапіў у няволю, потым быў выпушчаны. Памёр у эміграцыі, у Швайцарыі.

## Цывілізацыйныя крытэрыі Літвіншчыны

Пэўным крытэрыем Літвіншчыны павінна стаць прыхільнасьць да лацінскай культуры і цывілізацыі. **Цывілізацыя – гэта мэтад супольнага жыцьця.** Мэтад, які праяўляецца ў адносінах да пяці паняцьцяў:

- дабро;
- праўда;
- здароўе і дабрабыт;
- прыгажосьць.

Літвіны маюць уласнае ўяўленьне ў гэтых паняцьцях, якое зьяўляецца вынікам шматвяковага досьведу жыцьця. Сёньняшняя праблема палягае на тым, што ў выніку вайсковых і грамадзкіх канфліктаў XIX – XX стст. колькасная і маёмасная прадстаўленасьць Літвінаў у Краі катастрафічна зьменшылася. Адпаведна і культурная спадчына, якая засталася па старых Літвінах аказалася быццам бы незапатрабаванай.

Але гэта ня так. Частка старых Літвінаў, якая яшчэ жыве, мае просты страх да публічнай дэманстрацыі ўласнай культуры, існуючы ў меншасьці. Другая частка, да якой належыць у асноўным малодшае пакаленьне, інтуітыўна шукаючы свае карані, адчулі свойскасьць Літвіншчыны і сталі Літвінамі з выбару. Наша задача зьвязаць паміж сабой гэтыя дзьве групы і такім чынам забясьпечыць непарыўнасьць традыцыі.

На чым жа палягаюць паняцьці Літвіншчыны?

### Дабро

Для Літвіна Дабро – гэта Дабро, аб якім навучае Сьвятая Каталіцкая Царква - Касьцёл. Ня трэба гэтае паняцьце разглядаць выключна ў

рэлігійным сэнсе. Дабро, аб якім навучае Каталіцкая Царква, мае дачыненьне да ўсіх людзей, незалежна ад іх веравызнаньня. Вядома, Царква моліцца за тых, хто яшчэ не ўспрыняў Сьвятла нашай веры, але гэта ня значыць, што ёй абыякавы зямны лёс іншаверцаў ці няверуючых. У гэтым сэнсе Дабром для чалавека ёсьць жыць у згодзе з маральнымі законамі ў дастатковым для свайго стану дабрабыце.

Праблемы ўзьнікаюць тады, калі гэтая аб’ектыўная праўда не знаходзіць увасабленьня ў рэальным жыцьці. У Рэспубліцы Беларусь найбольш яскрава гэта праяўляецца ў пытаньнях абароны жыцьця ад нараджэньня да сьмерці і ўласнасьці.

## Праўда

Праўдай зьяўляецца максімальна набліжанае, паводле людзкіх здольнасьцяў, паняцьце аб рэчаіснасьці. Мы верым у тое, што чалавек, які сапраўды імкнецца пазнаць аб’ектыўную Праўду, у сілах яе пазнаць. Найбольш на перашкодзе гэтага пазнаньня стаяць разнастайныя зафальшаваньні гісторыі, якія дарэчы датычаць таксама нашага Імя Літвінаў і нашага Лёсу. Мы мусім даць праўдзівае сьведчаньне аб тым, кім мы ёсьць і што з намі адбылося. Пачынаючы ад канца XVIII ст., праз рэпрэсыі эпохі паўстаньняў XIX ст., рэпрэсыі сярэдзіны XX ст. у Катыні і ў Курапатах нас зьнішчалі! Але дзякуючы Богу мы выжылі і цяпер можам даць сьведчаньне аб сабе!

## Здароўе і дабрабыт

Паняцьце Здароўя ёсьць зразумелым для ўсіх. Адзінае на што трэба зьвярнуць увагу, гэта на тое, што паняцьці ніжэйшага рангу ня могуць супярэчыць паняцьцям вышэйшага, гэта значыць, што нельга будаваць свайго здароўя і дабрабыту, адмаўляючыся ад Праўды.

Асабістая і нацыянальная гісторыя сьведчыць, што такі, выключна часовы, дабрабыт ніколі для чалавека сапраўднага Дабра ня прыносіў.

Таксама агульна зразумелы сэнс паняцьця Дабрабыту. Заўва-

## Стаць Літвінам і быць ім!

Мы ведаем зараз, што значыць быць Літвінам, **але трэба ім стаць!** Дзіўная хіба думка, але зразумелая пры нашай гісторыі. У сёньняшнім часе шмат хто з жыхароў Рэспублікі Беларусь мае ў сабе літвінскія карані. Але праз сацыяльныя і дэмаграфічныя зьмены, яны парасьлі зельлем маскоўска-савецкага, туранска-бізантыйскага засеву. Зельле нагэтулькі закарэнілася ў нашу зямлю, што пытаньне стаіць аб самім нашым існаваньні. Альбо мы яго вырвем з сябе з каранямі і ачысьцім нашую глебу для роднай Літвіншчыны, ці занепадзем канчаткова ў туранскім багне.

Таму на першым месцы ёсьць дзеяслоў **Стаць**. Стаць Літвінам, а ўжо потым ім быць. Натуральна гэта не датычыць тых старых Літвінаў, якія імі ўжо ёсьць, але пераважная большасьць з нас Літвінамі паводле сваёй культуры яшчэ не зьяўляюцца. У нас ёсьць моцнае жаданьне быць Літвінамі, але для гэтага прыйдзецца пакласьці яшчэ шмат намаганьняў, каб адпавядаць годнасьці гэтага імя.

І першым крокам да вызваленьня з сецяў, накінутых маскоўска-туранскімі рэжымамі ёсьць вызначэньне і дэкларацыя Праўды аб сабе – мы ёсьць Літвінамі! Сёньня ёсьць выдатная магчымасьць засьведчыць аб гэтай Праўдзе. Улада Рэспублікі Беларусь абвесьціла аб правядзеньні перапісу насельніцтва. У пункце № 9 “Перапіснага ліста” ёсьць пытаньне аб нацыянальнасьці рэспандэнта. Нажаль гэтая ўлада не ўпісала туды, як адзін з адказаў “Літвін”, але мы можам зрабіць гэта самі, калі ў падпункце 5 № 9 “Другая” упішам ЛІТВІН. Гэта будзе сьведчаньнем таго, што – МЫ ЛІТВІНЫ ЁСЬЦЬ!



ПЕРЕПИСЬ НАСЕЛЕНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ 2009

КОНФИДЕНЦИАЛЬНОСТЬ ГАРАНТИРУЕТСЯ ПОЛУЧАТЕЛЕМ ИНФОРМАЦИИ

УТВЕРЖДЕНО
Постановление
Министерства
статистики и анализа
Республики Беларусь
№

**ПЕРЕПИСНОЙ ЛИСТ**

Форма 2Н

№ переписного участка | № инструкторского участка | № счетного участка | № помещения в пределах счетного участка | № домохозяйства в пределах помещения | № бланка в пределах портфеля

№ п.п. лица (из гр.1 списка)    Фамилия, инициалы

**1. Назовите, пожалуйста, дату Вашего рождения:**
число | месяц | год | число исполнившихся лет

**2. Ваш пол:** 1 мужской 2 женский

**3. В каких родственных или других отношениях Вы состоите с лицом, записанным первым в домохозяйстве?**
1 лицо, записанное первым в домохозяйстве
2 жена, муж, сожительница, сожитель
3 дочь, сын
4 мать, отец
5 сестра, брат
6 свекровь, свекор, теща, тесть
7 невестка, зять
8 бабушка, дедушка
9 внучка, внук
10 другая степень родства, свойства
11 не родственник
*№ п.п. матери (отца) (из гр.1 списка)*

*Для лиц в возрасте 15 лет и старше*

**4. Ваше брачное состояние:**
1 никогда не состоял(а) в браке
2 состою в зарегистрированном браке
3 состою в незарегистрированных отношениях
4 вдовец, вдова
5 разведен(а) официально
6 разошелся(лась)
*№ п.п. супруга(и), сожителя(ницы) (из гр.1 списка)*

**5. Место Вашего рождения:**
1 Республика Беларусь
2 другая страна — укажите название

**6. В этом городском поселении или сельской местности этого района Вы проживаете непрерывно с рождения?**
1 да → *к вопросу 8*
2 нет

**6.1 Укажите период, когда Вы прибыли в данный населенный пункт:**
1 до 2005 года → *к вопросу 8*
2 с 2005 года по настоящее время (укажите: месяц, год) — месяц, год

**6.2 Укажите место Вашего предыдущего жительства**
1 Республика Беларусь
1 городское поселение — укажите тип и название городского поселения
2 сельская местность — укажите название района
2 другая страна — укажите название
*к вопросу 7.3*

**7. Проживали Вы более 1 года в какой-либо другой стране с 2005 г. по настоящее время?**
1 да 2 нет → *к вопросу 8*

**7.1 Из какой страны Вы прибыли в Республику Беларусь на постоянное место жительства?**
укажите название

**7.2 Укажите год и месяц прибытия:**
месяц | год

**7.3 По какой причине Вы прибыли в Республику Беларусь на постоянное место жительства?**
*(Укажите только одну основную причину)*
1 работа
2 учеба
3 создание семьи
4 возвращение к прежнему месту жительства
5 семейные обстоятельства
6 поиск убежища
7 другая причина

**8. Ваше гражданство:**
1 Республика Беларусь
2 другая страна — укажите название
3 без гражданства

**9. К какой национальности Вы себя относите?**
*(по самоопределению и желанию опрашиваемого лица; для детей – по определению родителей)*
1 белорус(ка)
2 русский(ая)
3 поляк (полька)
4 украинец(ка)
5 другая — Л І Т В І Н(К А) — укажите национальность
6 национальность не сообщил(а)

**10. Ваш родной язык:**
1 белорусский
2 русский
3 другой — укажите название языка

**11. На каком языке Вы обычно разговариваете дома?**
1 белорусский
2 русский
3 другой — укажите название языка

**12. Другой(ие) язык(и), которым(и) Вы свободно владеете:**
1 белорусский
2 русский
3 другой(ие) язык(и)
4 не владею

## Асобы і факты сьведчаць аб Літве

Spiritu exultante percepimus, quod inspirationis divine gratia faciente carissimus in Christo filius noster Mindowe, rex Lithowie, olim cum grandiosa infidelium multitudine existens in perfidie tenebris, se ad divini nominis gloriam regenerari fecit per unde gratiam baptismalis.

З духовай радасьцю мы давдеаліся, што з ласкі Божага натхненьня найдаражэйшы ў Хрысьце сын наш Міндаў, кароль Літовіі, будучы некалі ў цемры адступніцтва зь велізарным мноствам няверных, даў адрадзіць сябе ласкаю хроснай купелі на славу імя Божага.

*Інацэнт, біскуп, слуга слугаў Божых, вялебным братам Мікалаю Рыскаму, Гэрману Дорпацкаму і Гэнрыку Эзэльскаму, Біскупам*

Народная песьня, якая ўслаўляла буйную перамогу гэтмана Астроскага над маскавітамі ў 1514 годзе, сьведчыць: “Слава Воршы ўжо ня горша сярод мест літоўскіх”.

Хіба я не літвін, Ваш зямляк, Вамі абраны? Каму павінен дзякаваць (за рэкамендацыю Брэсцкага сойміка), калі не Вам? Каго павінен абараняць, калі не Вас і сябе самога?

*Тадэвуш Касьцюшка*

Літва! Ты як здароўе ў нас, мая айчына!
Што варта ты, ацэніць толькі той належным чынам,
Хто цябе страціў. Вось тваю красу жывую
Зноў бачу і апісваю, бо скрозь сумую.

*Адам Міцкевіч*

Litwa żyje! Litwa żyje!
Słońce dla niej błyszczy chwałą,
Tyle serc dla Litwy bije,
Tyle serc już bić przestało.

Nikt nas teraz nie obwini,
Nikt na świecie nia zapyta:
Czy jeszcze żyją Litwini?
Oto Pogoń nasza świta!

Літва жыве! Літва жыве!
І слонца шле ёй промні хвалы,
І столькі сэрц для Краю б'ецца!
І столькі сэрцаў біцца перастала.

Нас ніхто цяпер не зьвінаваціць,
Нас ніхто цяпер не запытае:
Ці жывуць яшчэ Літвіны ў сьвеце?
Вось Пагоня нашая лятае!

*Юльюш Славацкі*

*Кастусь (Канстанты) Каліноўскі* – кіраўнік Літоўскага Правінцыяльнага Камітэту ў часе паўстаньня 1863 г.

*Паэта Ўладзіслава Сыракомлю* сучасьнікі называлі "лірнікам літоўскім"

*Пісьменьнік Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* "Літвою" лічыў Менск, у якім тады жыў.

*Пісьменьнік Арцём Вярыга-Дарэўскі*, які нарадзіўся на Лепельшчыне і жыў у Віцебску, пісаў у сваім творы: “Літва - родная зямелька”. Вядомы ягоны верш з красамоўнаю назваю “Літвінам, што запісаліся ў мой “Альбом”, на разьвітаньне” (1858), у якім аўтар, між іншым, усклікаў: “Чый гэта голас? Гэты словы нашы, браценькі-літоўцы”.

“...Лічыў сябе Літвіном”
*сьведчаньне Кастуся Езавітава аб Станіславу Булаку-Балаховічу*

Апошняя спроба адрадзіць ВКЛ: утварэньне Сярэдняй Літвы (Litwa Środkowa) са сталіцай у Вільні, паводле канцэпцыі *Юзэфа Пілсудзкага, на чале з гэнэралам Люцыянам Жалігоўскім*, да якой павінны былі быць далучаны на фэдэратыўных асновах Паўночная Літва з цэнтрам у Коўні і Усходняя Літва з цэнтрам у Менску. Дзяржава Сярэдняя Літва існавала ў 1920-1922 гг. На яе сьцягах былі Арол і Пагоня, а войска складала I Літоўска-Беларуская Дывізія, якая складалася з жыхароў Віленшчыны і Меншчыны.

Наша імя словы два –
Мы – Вялікая Літва!

*Вінцук Адважны*

**Стаць Літвінам і быць ім:** развагі да перапісу 2009 г., А.Стральцоў-Карвацкі;
Меньск-Літоўскі, 2008. - 24 с.

© тэкст **А.Стральцоў-Карвацкі**